

## МЕЛЕЖ ІВАН ПАЎЛАВІЧ
**(8.2.1921г. – 9.8.1976 г.)**

**І.Мележ** – пісьменнік, народны пісьменнік Беларусі (1972), лаўрэат Ленінскай прэміі (1972).

Гэта буйная, маштабная постаць у беларускай літаратуры 2-й паловы XX ст. Узлёт творчай асобы І.Мележа прыпадае на 1960–1970-я гг., калі ён напісаў «Палескую хроніку» – серыю раманаў, што былі інсцэніраваны, экранізаваны і ўвогуле паўплывалі на развіццё беларускай мастацкай культуры.

І.Мележ нарадзіўся ў в.Глінішча Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і. Скончыў школу ў родных мясцінах, вучыўся ў Маскоўскім інстытуце гісторыі, філасофіі і літаратуры. Затым – вайна, фронт, цяжкае раненне. Пасля шпіталя (1942) працуе і вучыцца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, размешчаным тады ў Маскве (скончыў у 1945 г.). Раннія апавяданні, аповесці (40-х – пачатку 50-х гг.) былі дастаткова прафесійнымі, але вядомасць прынёс раман «Мінскі напрамак» (1952) – вялікае эпічнае палатно пра жыццё фронту падчас вызвалення сталіцы Беларусі. Раман меў добры рэзананс.

Якасна новы этап творчасці І.Мележа пачынаецца з сярэдзіны 50-х гг., народжаны кліматам тагачаснай палітычнай «адлігі» ў СССР. Пісьменнік стварае цыкл раманаў пра народнае жыццё яго роднага Палесся, якое ўвасабляе праўдзіва, псіхалагічна глыбока, ва ўсёй шматколернасці яго праяў. Выходзяць раманы «Людзі на балоце», «Подых навальніцы», «Завеі, снежань». Цяжкія хваробы як вынік франтавых выпрабаванняў абрываюць жыццё пісьменніка і яго эпічную задуму. Аднак і ў такім выглядзе «Палеская хроніка» – падзея культурнага жыцця Беларусі. Аўтар раскрыў сілу і хараство жыцця працоўнага беларуса, паказаў непаўторнасць прыроднай стыхіі палескага краю, выявіў рэальны драматызм сацыяльна-грамадскіх працэсаў жыцця даваенных гадоў. Тыпы, створаныя пісьменнікам, пластыч-

## MELEZH, IVAN PAULAVICH
**(b.8.2.1921 – d.9.8.1976)**

**I. Melezh**, a writer, the People's Writer of Belarus (1972), a recipient of the Lenin Prize (1972).

I.Melezh was an important large-scale figure in Belarusian literature of the second half of the 20th century. His creative work was at its height in the 1960–70s, when he wrote a series of novels *Paleskaya Chronika* (Palesse Chronicle) which were staged, filmed and in general, they influenced the development of Belarusian artistic culture.

I.Melezh was born in the village of Hlinishcha, the Hoyniki district of the Homel Region to a peasant family. He finished a local school, and then studied at Moscow Institute of History, Philosophy and Literature. Then he lived through the hard times of the war, front and a serious wound. After hospital (1942) I. Melezh worked and studied at the Belarusian State University, situated in Moscow at that time (he graduated from it in 1945). His early stories and short stories (the 1940s – the early 1950s) were quite professional, but it was the novel *Minsky napramak* (The Minsk Direction, 1952) that brought him fame. This is a great epic about a front life during the Belarusian capital liberation. The novel had a good resonance.

A qualitatively new stage of I. Melezh's creative work began in the mid-1950s and was caused by the political 'thaw' period in the USSR. The writer created a series of novels about the people's life of his native Palesse, which he depicted truly, psychologically deeply, and in the variety of its manifestations. The novels *Ludzi na Balotse* (People in the Marshes), *Podych Navalnitsy* (The Breath of the Thunderstorm), *Zaveyi, snezhan* (Snowstorms, December) were published. Serious diseases, which were the result of his front ordeals, broke off his life and his epic ideas. But even in its present form the *Palesse Chronicle* became an important event in the cultural life of Belarus. The author described the power and beauty of an ordinary working Belarusian , the unique nature of Palesse, and the real tragedy of the social and public processes in



Created by free version of DocuFreezer

на распрацаваныя, унутрана складаныя, адны з лепшых у галерэі створаных нацыянальнай літаратурай на працягу сваёй гісторыі. Раманы нясуць вялікі гуманістычны патэнцыял, увасабляючы праўду народнага жыцця цэлай эпохі.

Для аўтара творы з цыкла «Палеская хроніка» былі вельмі дарагой часткай жыцця, і нават у нелітаратурных размовах гэты інтэлігентны і сціплы чалавек паварочваў да сваіх любімых герояў, без якіх ужо не мог існаваць. Ён таксама аўтар многіх зборнікаў аповесцяў і апавяданняў.

І.Мележ быў узнагароджаны Дзяржаўнай прэміяй (1976) і Літаратурнай прэміяй імя Я.Коласа (1962).

На працягу многіх год ён быў членам Сусветнага савета міру, старшынёй Беларускага камітэта абароны міру, старшынёй Беларускага аддзялення таварыства «СССР–Францыя».

Памёр і пахаваны ў Мінску.

У яго роднай в.Глінішча дзейнічае музей пісьменніка. У 1979–1985 гг. выдадзены збор яго твораў у 10 тамах.

У 1980 г. устаноўлена Літаратурная прэмія Саюза пісьменнікаў Беларусі імя І.Мележа.

life in prewar years. The characters created by the author, carefully developed and inwardly sophisticated, are among the best in the gallery of the characters created by national literature throughout its history. The novels have great humanistic potential, containing the truth of people's life of the whole epoch.

For the author, the *Palesse Chronicle* was a very dear part of life, even in his non-literary talks this educated and modest person referred to his precious heroes without which he could not imagine his life. He is also the author of many collections of novellas and short stories.

i.Melezh was a recipient of the National Literary Prize, (1976) and the Yakub Kolas Literary Prize (1962).

For many years he was a member of the World Peace Council, headed the Belarusian Peace Committee, Belarusian branch of the USSR-France Society.

Ivan Melezh died and was buried in Minsk.

In his native village of Hlinishcha there is a museum of Ivan Melezh. In 1979–1985 his collection of works was published in 10 volumes.

Since 1980 the I. Melezh Literary Prize of the Belarusian Writer's Union has been awarded.

Created by free version of DocuFreezer